BIBLE 316

# Што такое Біблія?

**Што такое Біблія?** У ёй Бог прамаўляе да вас. Яна не толькі пра Бога. Яна ад Бога. Яна не проста натхняе. Яна богадухнавенная. Чытайце яе. Слухайце яе. Думайце пра яе. Навучайцеся ад яе. Дастасуйце сваё жыцьцё да яе. Апостал Пётра піша: *"як нованароджаныя немаўляты, зажадайце чыстага слоўнага малака, каб ад яго вы расьлі,"* 1 Пятра 2:2.

**Што робіць Біблію ўнікальнай?** Больш за 40 аўтараў напісалі 66 біблейскіх кніг трыма рознымі мовамі (старажытнагебрайскай, арамейскай, старажытнагрэцкай) цягам 1600 гадоў з адной агульнай і пасьлядоўнай тэмай, якая разьвівалася цягам стагоддзяў. Аўтэнтычнасьць Новага Запавета падцвярджаецца больш чым 5000 (пяцьцю тысячамі) старажытных поўных ці частковых манускрыптаў. Дакладнасьць Бібліі была верыфікавана споўненымі прароцтвамі, сучаснымі археалагічнымі дасьледваньнямі, геаграфічнымі ўказальнікамі, а таксама невычэрпнай мудрасьцю Прыповесьцяў. Біблія зьяўляецца найбольш важнай і ўплывовай кнігай у гісторыі. Ніводная іншая кніга не была выдадзена такім накладам, так шырока распаўсюджана, перакладзена на мноста моў, не зьмяняла жыцьці і заставалася актуальнай напрацягу стагоддзяў. Біблія зьяўляецца адзіным найвышэйшым аўтарытэтам ў пытаньнях ува што нам верыць і як нам жыць. Біблія стаіць вышэй за ўсе іншыя кнігі.

**Якія адметнасьці Бібліі?**

Біблія зьяўляецца Боганатхнёнай. *"Усё Пісаньне натхнёнае Богам і карыснае дзеля навучаньня, дзеля дакараньня, дзеля выпраўленьня, дзеля дысцыплінаваньня ў праведнасьці,"* 2 Цімафея 3:16.

Біблія зьяўляецца ісьціннай. Ісус маліўся: *"Асьвяці іх у праўдзе Тваёй! Слова Тваё – праўда,"* Яна 17:17.

Біблія зьяўляецца дакладнай да самых дробязяў: *"Бо сапраўды кажу вам: пакуль не праміне неба і зямля, аніводная ёта ці рыска не праміне з Закону, пакуль ня станецца ўсё,"* Мацьвея 5:18. Дакладнасьць арыгінальных манускрыптаў была захавана і цяпер найлепшыя даслоўныя пераклады сягаюць 99 адсатковай адпаведнасьці.

Біблія зьяўляецца чыстай. *"Словы ГОСПАДА – чыстыя словы, срэбра ў горне ад зямлі ачышчанае, сямікроць ператопленае,"* Псалтыр 12:7.

Біблія – вечная. *"Высыхае трава, вяне кветка, але слова Бога нашага трывае на вякі,"* Ісаі 40:8. Біблія застаецца рэлевантнай і сёньня гэтаксама, як у дзень свайго напісаньня.

Біблія зьяўляецца магутнай. Ліст да Яўрэяў 4:12: *"Бо слова Божае жывое і дзейснае, і вастрэйшае за ўсякі меч двусечны, і працінае аж да разьдзяленьня душы і духа, суставаў і шпіку, і судзіць думкі і намеры сэрца".*

**Ці ёсьць асабістыя выгоды ад Бібліі?**

Біблія аснашчае нас: *"Усё Пісаньне натхнёнае Богам і карыснае дзеля навучаньня, дзеля дакараньня, дзеля выпраўленьня, дзеля дысцыплінаваньня ў праведнасьці, каб дасканалым быў чалавек Божы, да ўсякае добрае справы гатовым,"* 2 Цімафея 3:16-17.

Біблія дапамагае нам не грашыць. Псальм 119:9, 11 распавядае нам як гэта зрабіць. *"Якім чынам юнак захавае ў чыстасьці сьцежку сваю? [Калі] будзе захоўваць [яе] паводле слова Твайго. У сэрцы маім я хаваю слова Тваё, каб не зграшыць супраць Цябе".*

Біблія дае кіраўніцтва на сённяшні дзень (наш наступны крок) і зьяўляе накірунак для будучыні (шлях якім ісьці). *"Слова Тваё – сьветач для ног маіх і сьвятло на сьцежцы маёй,"* Псальм 119:105.

Біблія дае мудрасьць. *“Адкрыцьцё словаў Тваіх асьвятляе, дае разуменьне неразумным,”* Псальм 119:130. Вечная мудрасьць знаходзіцца ў Прыповесьцях у Старым Запавеце.

Біблія дапамагае нам ісьці праз цяжкасьці. Псальм 119:50 заахвочвае нас: *“Гэта пацяшэньне маё ў нядолі маёй, бо слова Тваё ажыўляе мяне”.*

Біблія дае надзею: *“Бо ўсё, што было напісана, было напісана дзеля нашага навучаньня, каб праз цярплівасьць і суцяшэньне з Пісаньняў мы мелі надзею,”* Рымлянаў 15:4.

Біблія дае супакой, Псальм 119:165 абяцае: *“Вялікі супакой Ты даеш тым, якія любяць закон Твой, і яны не спатыкнуцца”.*

Біблія прыносіць радасьць. Кніга прарока Ярэміі 15:16 дае прыклад: *“Я знайшоў словы Твае і праглынуў яго, і сталася слова Тваё для мяне пацяшэньнем і радасьцю сэрца майго, бо заклікалася імя Тваё нада мною, ГОСПАДЗЕ, Божа Магуцьцяў”.*

**Як трэба чытаць і слухаць Біблію?** Прааналізуйце больш за адзін верш. Разгледзьце чатыры мэты з 2 ліста да Цімафея 3:16: *“Усё Пісаньне натхнёнае Богам і карыснае дзеля навучаньня, дзеля дакараньня, дзеля выпраўленьня, дзеля дысцыплінаваньня ў праведнасьці”.* Калі вы чытаеце ці слухаеце задайцеся гэтымі чатырма пытаньнямі. Чаму гэта навучае нас? Як гэта пераконвае нас? Што я мушу падкарэктаваць? Як гэта дапаможа мне быць больш праведным?

**А што калі ў мяне раптам няма Бібліі?** Прыкладзіце намаганьні каб набыць выданьне з добрым перакладам Бібліі. Калі вы не можаце набыць, памятайце, што шмат перакладаў зьмешчаны ў агульным доступе онлайн для чытаньня ці праслухоўваньня. Дамоўцеся з сябрам ці сябрамі набыць Біблію разам і супольна карыстацца ёю. Ці папрасіце кагосьці з царквы прачытаць Біблію ў групе і слухайце ўважліва: А Ён сказаў: *“Наадварот, шчасьлівыя тыя, якія чуюць слова Божае і захоўваюць яго,”* Лукаша 11:28.

**Якія адмысловыя вершы для настаўнікаў Бібліі і лідараў?** Будзьце вучнем Ісуса выконваючы (жывучы) ў Слове. Так Ісус казаў яўрэям, якія верылі ў Яго. *“Тады сказаў Ісус Юдэям, якія паверылі ў Яго: ‘Калі застанецеся ў слове Маім, дык сапраўды вы – вучні Мае,’”* Яна 8:31. Вывучайце Біблію, каб быць вартым: *“Намагайся паставіць сябе перад Богам вартым, работнікам, які ня будзе асаромлены, які слушна пераказвае слова праўды,”* 2 Цімафея 2:15.

**Чаму Біблія жыцьцёванеабходная?** Апостал Ян растлумачыў сваю мэту ў напісаньні Эвангельля. Гэтую мэту можна выкарыстаць у дачыненьні ўсёй Бібліі. *“Тады шмат іншых знакаў учыніў Ісус перад вучнямі Сваімі, пра якія не напісана ў гэтай кнізе. А гэта напісана, каб вы паверылі, што Ісус ёсьць Хрыстос, Сын Божы, і каб, веручы, мелі жыцьцё ў імя Яго,”* Яна 20:30-31. Як паверыць у Ісуса і мецт жыцьцё вечнае? Даведайся на сайце www.Gospel316.org.

**“Высыхае трава, вяне кветка, але слова Бога нашага трывае на вякі,” Ісаі 40:8.**

*“Што такое Біблія?”* © 2025 Джон Д. Морыс III прадстаўлена “Acts One Eight”. Вы можаце друкаваць, капіяваць, дасылаць і распаўсюджваць яго змест нязменным уключна з гэтым палажэннем. Вы можаце дадаць лагатып і назву вашай царквы ці служэння на вяршыні старонкі, а таксама дадаць кантактную інфармацыю ўнізе другой старонкі. Bible316 грунтуецца выключна на Бібліі. Праэкт існуе каб дапамагчы людзям прыйсці да веры ў Ісуса Хрыста, потым расці каб быць Яго вучнямі. Вы можаце напісаць да Acts One Eight (па-магчымасці па-ангельску) на адрэсу Hello@Matt316.org. Праца па перакладзе на іншыя мовы з ангельскай была ажыцяўлена www.ChristianLingua.com. Што такое Біблія? Дасяжная на 48 мовах бясплатна на сайце www.Bible316.org. Біблейскія цытаты ў англамоўнай версіі прыведзеныя ў адпаведнасці з The Lockman Foundation’s New American Standard Bible 1995. Біблейскія цытаты ў гэтым перакладзе прыведзены ў адпаведнасці з выдання “Біблія. Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага Запавету. Пераклад Антонія Бокуна. 2023.”